УДК 070.423.1(091)(476)

# ПЕРШЫ УСЕБЕЛАРУСКІ З'ЕЗД КАРЭСПАНДЭНТАЎ 1924 г.: ПАДРЫХТОЎКА, ПРАВЯДЗЕННЕ, АСНОЎНЫЯ ПАСТАНОВЫ І РОЛЯ Ў РАЗВІЦЦІ КАРЭСПАНДЭНЦ-КАГА РУХУ Ў БССР

**Д.С. Пыж**, малодшы навуковы супрацоўнік
**Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі**

Перыядычны друк у Савецкай Беларусі ў 1920-я гг. з’яўляўся адным з ключавых сродкаў грамадскай камунікацыі. Патрэба ў пашырэнні і ўмацаванні сацыяльнай базы бальшавікоў, інфармацыйным аснашчэнні выданняў ва ўмовах адсутнасці падрыхтаваных прафесійных кадраў у сферы журналістыкі абумовіла стварэнне шырокай сеткі карэспандэнтаў, якія ажыццяўлялі сувязь насельніцтва з рэдакцыямі.

З 1917 г. па 1924 г. колькасць карэспандэнтаў на тэрыторыі Беларусі ўзрасла ад адзінкавых інфарматараў да шырокай сеткі, якая ўключала ў сябе каля 2800 чалавек [2, л. 43]. Павелічэнне колькасці карэспандэнтаў абумовіла неабходнасць стварэння механізму кіравання і арганізацыі інфарматараў на розных узроўнях, з якіх вылучаюцца агульнарэспубліканскія з’езды.

Скліканне І Усебеларускага з’езда карэспандэнтаў патрабавала правядзення падрыхтоўчай работы, якая заключалася ў арганізацыі з’ездаў на розных адміністрацыйна-тэрытарыяльных узроўнях: у акругах і раёнах [2, л. 41]. Асноўнай задачай пасяджэнняў стала вылучэнне карэспандэнтаў на Рэспубліканскі з'езд, а таксама вызначэнне лепшых сцянных газет для ўдзелу ва Усебеларускай выставе, якая праходзіла ў рамках І Усебеларускага з'езда карэспандэнтаў [1, л. 1].

Пасяджэнне І Усебеларускага з’езда карэспандэнтаў адбылося 24 верасня 1924 г., на якім прысутнічала 165 дэлегатаў з 11 населеных пунктаў (табл. 1, 2).

Табліца 1. – Тэрытарыяльная прыналежнасць дэлегатаў І Усебеларускага з’езда карэспандэнтаў [3, с. 62].

| Населены пункт | Колькасць дэлегатаў (чалавек) |
|---|---|
| Мінск | 55 |
| Віцебск | 23 |
| Орша | 7 |
| Полацк | 4 |
| Магілёў | 12 |
| Калінінск | 3 |
| Барысаў | 23 |
| Бабруйск | 18 |
| Слуцк | 10 |
| Мазыр | 5 |
| Жлобін | 5 |

Табліца 2. – Узроставы склад дэлегатаў І Усебеларускага з’езда карэспандэнтаў [3, с. 63].

| Узрост дэлегатаў | Колькасць дэлегатаў (чалавек) |
|---|---|
| Да 20 гадоў | 40 |
| Ад 21 да 30 гадоў | 83 |
| Ад 31 да 40 гадоў | 35 |
| Звыш 40 гадоў | 7 |

На пасяджэнні быў зроблены даклад аб становішчы друку ў БССР на якім дэлегатаў азнаёмілі з колькасцю газет і часопісаў, якія выдаюцца ў Беларусі, іх тыражом і моўнымі характарыстыкамі;

распаўсюджваннем перыядычнага друку; абсталяваннем выдавецтваў. Асноўная частка парадку дня была прысвечана карэспандэнцкаму руху: задачам інфарматараў, уцягванню жанчын у працу з рэдакцыямі друкаваных выданняў, абароне карэспандэнтаў; патрабаванням да напісання артыкулаў у перыядычныя выданні і неабходнасці прадастаўлення праверанай інфармацыі [3, с. 15–51].

Вынікам з’езда сталі пастановы па асноўных напрамках як выдавецкай справы ў цэлым, так і карэспандэнцкага руху ў прыватнасці. У якасці асноўнай задачы карэспандэнта была пазначана “усямерная дапамога будаўніцтву рабоча-сялянскай дзяржавы, выяўляючы і асвятляючы жыццё працоўнага класа, адзначаючы станоўчыя і адмоўныя бакі жыцця”.

У выніковай рэзалюцыі адзначалася патрэба ў прыцягненні новых карэспандэнтаў, у тым ліку і жанчын, згодна лозунгу “кожны чытач павінен быць адначасова і супрацоўнікам газеты”; удзеле інфарматараў у распаўсюджванні друку і стварэнні сцянных газет. Асобым пунктам вылучаліся патрабаванні да асабістых якасцей карэспандэнта, які павінен быць “самым дысцыплінаваным, перадавым работнікам, на вопыце паказваць, як трэба будаваць рабоча-сялянскую дзяржаву”.

Кіраўніцтва карэспандэнцкім рухам, згодна з пастановай з’езда, павінна было ажыццяўляцца карэспандэнцкімі бюро, якія ствараліся ў акругах і раёнах і куды ўваходзілі ўсе інфарматары, якія адносяцца да заяўленай тэрыторыі. Пры рэдакцыях перыядычных выданняў утвараліся цэнтральныя карэспандэнцкія бюро, якія аб’ядноўвалі прадстаўнікоў пэўных выданняў. Агульнае кіраўніцтва карэспандэнцкай сеткай ажыццяўляў аддзел друку пры ЦК КП(б)Б.

На з’ездзе былі пазначаны асноўныя напрамкі развіцця перыядычнага друку ў Беларусі: 1. Павелічэнне накладу выданняў, якія друкуюцца на мове, адрознай ад рускай; 2. Спрашчэнне стылю напісання газет; 3. Паляпшэнне тэхнікі друку перыядычных выданняў [3, с. 54-61].

Рэзюмуючы вышэйпададзенае, варта адзначыць, што І Усебеларускі з’езд карэспандэнтаў стаў адпраўной кропкай да каардынацыі карэспандэнцкай сеткі з дапамогай канферэнцый, якія арганізуюцца згодна з адміністрацыйна-тэрытарыяльным прынцыпам. Акрамя гэтага, у пастанове з’езда былі сфармуляваны, абагульнены і апублікаваны асновы арганізацыі і кіраўніцтва інфарматарамі ў Савецкай Беларусі.

## Спіс літаратуры

1. Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці (ДАГАМаг). – Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 77.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 1809.
3. Первый Всебелорусский съезд корреспондентов (материалы и постановления). Минск, 1924.